Интернет стал средством обмена информацией по всему миру. Попавшая в сеть Интернет персональная и служебная информация может создать условия для совершения киберпреступлений.

Уголовная ответственность за киберпреступления предусмотрена в ряде статей Уголовного кодекса Республики Беларусь: ст. 212 «Хищение имущества путем модификации компьютерной информации»; ст. 349 «Несанкционированный доступ к компьютерной информации»; ст. 350 «Уничтожение, блокирование или модификация компьютерной информации»; ст. 352 «Неправомерное завладение компьютерной информацией»; ст. 354 «Разработка, использование, распространение либо сбыт вредоносных компьютерных программ или специальных программных или аппаратных средств»; ст. 355 «Нарушение правил эксплуатации компьютерной системы или сети».

Преступления в сфере информационных технологий часто являются международными. В связи с этим для предотвращения таких преступлений важное значение имеет не только международное сотрудничество, но и подготовка соответствующих специалистов, которые могут эффективно противодействовать совершению киберпреступлений.

*УДК 321(474/476ВКЛ)(091)*

# НАВАГРАДАК ЯК ПАЛІТЫЧНЫ ЦЭНТР ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА: ГІСТАРЫЧНЫ СТАТУС І СУЧАСНЫЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

В. М. Лянцэвіч
УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
М.В. Пляханаў, В.Д. Карсіна,
студэнты
УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) – дзяржавы, што праіснавала звыш пяцісот гадоў, існуючы як магутнае незалежнае шматэтнічнае аб’яднанне, а пазней і як канфедэрацыя з Каралеўствам Польскім, – дагэтуль выклікае шмат спрэчак наконт таго, каму належыць яе багатая гістарычная спадчына. Дзяржава, якая ў часы свайго росквіту распасцёрлася ад узбярэжжа Чорнага да хваль Балтыйскага мора, аб’ядноўвала розныя народы, культуры і традыцыі, пакінуўшы глыбокі адбітак у гісторыі Усходняй Еўропы. Разнастайнасць народаў, моў і культур, якія суіснавалі ў межах дзяржавы, зрабіла ВКЛ сапраўдным полікультурным і поліканфесійным утварэннем. Гэта спрыяла развіццю права, адукацыі і культуры, у тым ліку славутаму Статутоваму заканадаўству ВКЛ – адной з найстарэйшых і найбольш прагрэсіўных кадыфікаваных крыніц права у Еўропе.

Аднак багатая гістарычная спадчына стала прычынай сучасных супярэчнасцяў. Беларускія, літоўскія, украінскія і польскія даследчыкі часта па–рознаму ацэньваюць ролю ВКЛ ў гісторыі сваіх народаў, кожны з якіх імкнецца прысвоіць яго дасягненні і культурныя набыткі. Менавіта таму не сціхаюць дыскусіі аб тым, хто з'яўляецца сапраўдным яе спадкаемцам. Каб даказаць сваю рацыю, краіны (у асобе навукоўцаў) пераасэнсоўваюць гістарычныя падзеі, пераглядаюць гістарычныя крыніцы і факты, шукаючы адпаведныя довады на карысць сваёй спадкаемнасці.

Асобнае пытанне – першасная сталіца ВКЛ. Бо факт знаходжання сталіцы ў той ці іншай дзяржаве сведчыць аб тым, што сумежныя з ёй землі адыгралі важную ролю ў фармаванні і стварэнні гэтага дзяржаўнага аб'яднання. Сталіца – гэта не проста адміністратыўнае месца, але і сімвал дзяржавы, яе сэрца. Выбар сталіцы заўсёды абумоўлены не выпадковасцю, бо гэта месца павінна мець стратэгічнае, культурнае і палітычнае значэнне, што спрыяе далейшаму развіццю і стабільнасці дзяржавы.

Варта звярнуць увагу на адно з даволі цікавых пытанняў, якое патрабуе дэталёвага аналізу: Навагрудак. Ці быў ён сапраўднай сталіцай ВКЛ ці толькі рэзідэнцыяй Вялікага князя? Правядзем аналіз паняццяў «сталіца» і «рэзідэнцыя» ў кантэксце сярэднявечнай дзяржаўнасці.

Да 1323 г., калі ўпершыню ў гістарычных крыніцах згадваецца сталічны горад – Вільня, няма дакументальных сведчанняў аб замацаванні раней нейкага іншага горада ў гэтым статусе. Аднак гэта не сведчыць пра тое, што раней не было горада, які б фактычна выконваў сталічныя функцыі. У той перыяд паняцце «сталіца» адрознівалася ад сучаснага разумення, але статус горада вызначаўся яго палітычнай і адміністрацыйнай роляй. Горад, дзе жыў і кіраваў князь–кіраўнік дзяржавы, дзе прымаліся лёсавызначальныя рашэнні і засяроджвалася дзяржаўная ўлада, фактычна адыгрываў ролю сталіцы, нават калі гэта не было замацавана юрыдычна. Некаторыя гарады можна лічыць сталіцамі de facto, паколькі менавіта ў іх канцэнтравалася палітычнае жыццё і кіраўніцтва дзяржавай.

У Сярэднявеччы «сталіца» была не заўсёды выразна акрэсленым і юрыдычна замацаваным паняццем. У адрозненне ад сучасных нацыянальных дзяржаў, дзе сталіца з'яўляецца адзіным асяродкам улады і афіцыйна прызнаным палітычным сэрцам краіны, у сярэднявечных манархіях гэты статус часта быў размытым. Сталіца ўспрымалася хутчэй як галоўны палітычны, адміністрацыйны і культурны цэнтр, дзе канцэнтравалася ўлада, прымаліся ключавыя дзяржаўныя рашэнні, праводзіліся сходы знаці і фарміравалася дзяржаўная палітыка.

Аднак уладар мог не быць пастаянна прывязаны да аднаго месца. Манархі і князі часта перамяшчаліся паміж рознымі гарадамі, умацаванымі замкамі і адміністрацыйнымі цэнтрамі, што дазваляла ім падтрымліваць кантроль над сваімі ўладаннямі. Менавіта таму існавала адрозненне паміж сталіцай і рэзідэнцыяй.

Сталіца – гэта горад, які выконваў функцыю галоўнага палітычнага і адміністрацыйнага цэнтра дзяржавы. Ён мог быць пастаянным або часова асноўным месцам, дзе засяроджвалася дзяржаўная ўлада. Яго значнасць абумоўлівалася не толькі прысутнасцю кіраўніка, але і дзейнасцю галоўных органаў улады, суда, фінансавай сістэмы і духавенства.

Рэзідэнцыя, у сваю чаргу, азначала месца часовага або пастаяннага пражывання кіраўніка дзяржавы. У сярэднявечных дзяржавах рэзідэнцыяй маглі быць розныя гарады і замкі, якія ў той ці іншы перыяд выконвалі сталічныя функцыі, але не заўсёды мелі статус сталіцы ў поўным сэнсе. Князь мог змяняць рэзідэнцыю ў залежнасці ад палітычнай і ваеннай сітуацыі, што адлюстроўвала гнуткасць сярэднявечнай дзяржаўнасці.

Гэта адрозненне асабліва важна для разумення статуса Наваградка ў гісторыі ВКЛ. Калі ён быў месцам, дзе знаходзіўся Вялікі князь і прымаліся ключавыя рашэнні, то мы можам казаць пра сталіцу de facto. Аднак калі ён толькі служыў часовай рэзідэнцыяй уладара без далейшага замацавання палітычнага і адміністрацыйнага цэнтру, то гэта ставіць пад сумнеў яго статус першаснай сталіцы ВКЛ.

Адпаведна гэтаму, аналіз паняццяў «сталіца» і «рэзідэнцыя» дазваляе больш дакладна ацаніць ролю Наваградка ў гісторыі ВКЛ і вызначыць, ці мог ён лічыцца першай сталіцай дзяржавы, альбо быў толькі яе палітычнай рэзідэнцыяй у пэўны прамежак часу.

Гісторыя Наваградка, як і іншых гарадоў Беларусі, пачынаецца з фармавання раннефеадальных княстваў на тэрыторыі, заселенай славянскімі супольнасцямі. Пачатак фарміравання Наваградка, па сцверджаннях археолагаў, адносіцца да канца X ст. На працягу стагоддзяў паселішча паступова ператваралася ў горад з развітай інфраструктурай: ужо ў XII ст. на месцы старажытнага паселішча ўзнікаюць агароджаныя комплексы, якія ўмацоўваюцца валамі і замкавымі мурамі. Выяўленыя археалагічныя матэрыялы – рэшткі замкавых сцен, княжацкія пячаткі і іншыя артэфакты – сведчаць пра працяглы і складана арганізаваны працэс гарадскога развіцця [1, с. 83–84]. Да сярэдзіны IX ст. на гэтай тэрыторыі ўзнікалі першыя паселішчы, якія пазней сталі цэнтрамі гарадской культуры і палітычнага жыцця. Археалагічныя даследаванні, праведзеныя вядомымі вучонымі, такімі як Э.М. Загарульскі, Г.В. Штыхаў, А.Р. Мітрафанаў, М.К. Каргер, В.Р. Тарасенка і іншыя, унеслі значны ўклад у вызначэнне часу і характару гэтых першапачатковых паселішчаў.

Асноўныя археалагічныя знаходкі дазволілі ўсталяваць, што на тэрыторыі Наваградка ўжо ў VIII–IX стст. існавалі паселішчы, якія маглі быць праўдзівымі фактарамі ўзнікнення гарадской супольнасці. Археалагічныя раскопкі дазволілі ідэнтыфікаваць паселішчы ў іншых сучасных беларускіх гарадах, такіх як Полацк, Віцебск, Лукомль, якія з’явіліся на шляху да фармавання паўнавартасных гарадоў сярэднявечнага тыпу. У X–XI стг. Наваградак можа разглядацца як адзін з асноўных цэнтраў развіцця палітычнага і эканамічнага жыцця ў рэгіёне [2, с. 4].

Археалагічныя даследаванні ў Наваградку з самага пачатку паказалі, што задоўга да таго часу, калі ён быў упершыню згаданы ў летапісах, тут існаваў старажытнарускі горад. Пісьмовыя сведчанні пра Наваградак не пачыналі, а нібыта завяршалі яго гісторыю. Гэта сведчыць аб тым, што Наваградак меў значнае мінулае яшчэ да свайго першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах.

Наваградак пачаў фармавацца як горад у канцы X ст. Паводле археалагічных даследаванняў, на працягу 100 гадоў, з канца X да рубяжа XI–XII ст., на месцы паселішча будаваліся і замянялі адно на адно некалькі паселішчаў. Пачатковая дата заснавання паселішча адносіцца да канца X ст., што пацвярджаецца матэрыяламі самых ранніх комплексаў. У XII ст. пасад ператварыўся ў акольны горад і быў абнесены валам, першапачатковая вышыня якога дасягала каля 3 метраў, а шырыня – каля 9–10 метраў.

У.Ц. Пашута называе Наваградак «цэнтральным горадам Чорнай Русі» и «асноўным цэнтрам літоўскай улады» у другой палове XIII ст. [3, с. 36], а таксама адносіць яго да найбуйнейшых гарадоў Паўднёва–Заходняй Русі нароўні з Уладзімірам, Холмам, Галічам, Перамышлем і Львовам. Гэта падкрэслівае яго значную ролю ў рэгіянальнай палітыцы і культуры.

У гістарычных крыніцах Наваградак часта згадваецца як магчымы цэнтр Літвы. Яшчэ пісьменнік Адам Міцкевіч (XIX ст.) пісаў: «Наваградак з даляў маячыў мурамі –Літвы тагачаснай сталіца» [4].

У перыяд кіравання Міндоўга (1237–1263) Наваградак адыгрываў некалькі вызначальных роляў. Ён функцыянаваў як ваенна–стратэгічны цэнтр, забяспечваючы абарону ад крыжакаў і галіцка–валынскіх атрадаў, а таксама як адміністрацыйная рэзідэнцыя, у якой размяшчаліся органы княжацкай улады. Дадзеныя з археалагічных даследаванняў, у тым ліку знаходкі ў XIII ст. пячатак, падкрэсліваюць яго ролю ў сістэме ранняй дзяржаўнасці ВКЛ.

Акрамя ваенна–адміністрацыйнай функцыі, Наваградак быў значным культурным і эканамічным цэнтрам [5, с. 308–309]. Наяўнасць храмаў сведчыць пра высокі ўзровень духоўнага жыцця.

Як падкрэслівае навуковец Алесь Краўцэвіч, фармаванне ВКЛ стала адказам на сур'ёзныя знешнія пагрозы: экспансію нямецкіх ордэнаў у Прыбалтыку і мангола–татарскія напады на ўсходнеславянскія землі ў 1238–1240 гг. Гэтыя выклікі, паводле канцэпцыі «выкліку і адказу» А. Тойнбі, спрыялі пераходу ад дынамічнай раўнавагі мясцовых палітычных структур да больш цэнтралізаванай дзяржаўнай формы [6, с. 31].

Пасля смерці Міндоўга ў 1263 г. палітычны цэнтр з цягам часу перамясціўся ў Вільню, што прывяло да змяншэння стратэгічнага значэння Наваградка. Вайсковыя пагрозы, частыя міжусобіцы і зрушэнне геапалітычных прыярытэтаў спрыялі зніжэнню яго ролі ў дзяржаўным кіраванні. Нягледзячы на гэта, гістарыяграфія з XVI ст. працягвае

прызнаваць Наваградак адным з асноўных палітычных і культурных цэнтраў ранняй літоўскай дзяржавы. У.І. Пічэта лічыў, што Міндоўг мог заснаваць сваю сталіцу менавіта тут. У сваіх працах ён падкрэслівае, што Наваградак быў адным з ключавых палітычных і культурных цэнтраў на ранніх этапах фармавання ВКЛ. Ён лічыў, што горад іграў важную ролю ў аб’яднанні балцкіх і славянскіх зямель, асабліва ў перыяд кіравання Міндоўга. Пічэта адзначае, што Наваградак быў не толькі адміністрацыйным цэнтрам, але і месцам, дзе адбываліся важныя гістарычныя падзеі, такія як каранацыя Міндоўга. Паводле яго меркавання, Наваградак быў «сярэднім горадам» паміж усходнеславянскімі і балцкімі землямі, што спрыяла яго стратэгічнаму значэнню ў фармаванні дзяржаўнасці ВКЛ [7, с. 107].

Гэтыя высновы падмацоўваюцца археалагічнымі даследаваннямі, якія сведчаць пра тое, што Наваградак існаваў задоўга да першых згадак у летапісах і меў багатую гісторыю. Пічэта лічыць, што горад быў адным з найважнейшых цэнтраў Чорнай Русі, што падкрэслівае яго значэнне ў рэгіянальнай палітыцы і культуры [7, с. 107].

Наваградак меў стратэгічнае значэнне. Паводле У.Ц. Пашуты, «Наваградак мог быць выкарыстаны Літвой для таго, каб адтуль рабіць набегі на Брэст, Холм і іншыя гарады Галіцкай зямлі» [3, с. 380]. Гэта сведчыць аб тым, што горад быў не толькі культурным і палітычным, але і важным ваенным пунктам. Як падкрэслівае А. Краўцэвіч, Наваградак быў першым цэнтрам ВКЛ, фактычна выконваючы сталічныя функцыі: тут канцэнтравалася ўлада Міндоўга, вяліся перамовы з суседзямі (напрыклад, з Галіцка–Валынскім княствам), а таксама фарміраваўся біэтнічны характар дзяржавы. Нават пазнейшы перанос палітычнага цэнтра ў Вільню не ануляваў ролю Наваградка як месца, дзе ўзнікла «новая форма арганізацыі» [6, с. 31].

Аналізуючы ранні перыяд ВКЛ, Краўцэвіч робіць выснову пра яго біэтнічны характар: «Галоўнай яе апорай былі ўсходнеславянскія (беларускія) гарады; пры стварэнні ВКЛ выкарыстоўваліся мясцовыя ўзоры ўсходнеславянскай дзяржаўнасці, а старабеларуская мова стала афіцыйнай. Пануючая дынастыя балцкага паходжання прыняла назву дзяржавы па славянскім падабенстве – «княства», племянная балцкая арыстакратыя стала часткай феадальнага класа – баяраў (у летувіскай мове нават не ўзнік уласны тэрмін для абазначэння ваенна–служылага саслоўя, а быў прыняты беларускі – баяры – bajorai); урадавай мовай стала старабеларуская і г.д.» [6, с. 32].

Сучасныя даследаванні навукоўцаў акцэнтуюць шматфункцыянальнасць Наваградка: горад быў не толькі ваенным і адміністрацыйным цэнтрам, але і важным вузлом у эканамічных, культурных і духоўных працэсах, якія спрыялі ўсталяванню і развіццю ВКЛ. Археалагічныя дадзеныя і пісьмовыя звесткі сумесна дазваляюць зрабіць выснову, што, нягледзячы на спрэчнасці адносна

месцазнаходжання каранацыі Міндоўга, Наваградак меў вызначальную ролю ў фармаванні ранняй дзяржаўнасці і з’яўляецца адным з галоўных сімвалаў гісторыі рэгіёна [5, с. 307–308]. Археалагічныя знаходкі паказалі, што Наваградак меў высокі ўзровень жыцця. Знойдзеныя «рэшткі вялікіх пабудоў, цэгла, аконнае шкло, прадметы раскошы і унікальныя вырабы» сведчаць пра развітую гарадскую інфраструктуру і рамёствы. Згадваецца таксама «Наваградская археалагічная калекцыя, якая ўключае ўнікальны шкляны посуд усходняга паходжання», што пацвярджае шырокія гандлёвыя сувязі [2, с. 6].

Адным з першых згадваннем пра Наваградак належыць да 1044 г. ў сувязі з паходам Яраслава Мудрага на Літву [5, с. 307]. Упершыню версія пра сталіцу Міндоўга ў Наваградку адлюстравана ў летапісах XVI ст. Цытата з «Хронікі Быхаўца» адлюстроўвае наступнае: «І зайшлі за раку Вілію, і потым перайшлі раку Нёман і знайшлі ў чатырох мілях ад ракі Нёман прыгожую гару, якая спадабалася ім, і яны стварылі на ёй горад і назвалі яго Новагародак. І зладзіў сабе князь вялікі і даў сталіцу і назваўся вялікім князем Новагародскім» [8].

У перыяд аб’яднання літоўскіх зямель пад уладай Міндоўга (каля 1238–1263) Літва знаходзілася на этапе фармавання дзяржаўнасці. Большасць яе тэрыторый заставалася слаба ўрбанізаванай, а галоўнымі цэнтрамі ўлады звычайна былі драўляныя замкі або месцы пражывання князя. Наваградак быў найбуйнейшым горадам рэгіёна дзякуючы свайму размяшчэнню на гандлёвых шляхах, умацаванай крэпасці і сувязям з гарадамі Полацкай зямлі, што дазваляла канцэнтраваць адміністрацыйныя, ваенныя і эканамічныя рэсурсы, неабходныя для сталіцы. Акрамя таго, Наваградак меў хрысціянскі храм – Царкву Барыса і Глеба, гэты храм існаваў з XI–XII стст. і з’яўляўся значным сакральным аб’ектам, што рабіла горад прыдатным месцам для каранацыі [1].

Паводле А. Краўцэвіча, Наваградак стаў цэнтрам балта–славянскага сімбіёзу, дзе ўсходнеславянскі гарадскі патэнцыял (пісьмовасць, адміністрацыйныя традыцыі) аб’яднаўся з ваенна–арганізацыйнымі рэсурсамі балцкіх эліт. Менавіта гэты саюз, ініцыяваны Наваградком каля 1248 г., Краўцэвіч лічыць падмуркам ВКЛ. Горад не быў пасіўным «удзельнікам», а выступаў як легітымная аснова новай дзяржавы: знешнія пагрозы (крыжакі, манголы) вымусілі мясцовыя эліты да цэнтралізацыі вакол Наваградка [6, с. 35].

Наваградак – гэта не толькі найбуйнейшы горад рэгіёна, які дзякуючы сваім гандлёвым шляхам, умацаванай крэпасці і цесным сувязям з Полацкай зямлёй канцэнтраваў усе неабходныя рэсурсы для дзяржаўнага кіравання, але і месца, дзе да сённяшняга дня існуе гара Міндоўга. Менавіта яна, верагодна, з’яўляецца месцам пахавання першага князя ВКЛ.

З 1300 па 1330 гг. Наваградак па ініцыятыве вялікага князя Віценя (1294–1315/16) стаў цэнтрам самастойнай Літоўскай праваслаўнай

мітраполіі пад юрысдыкцыяй Канстанцінопаля [6, с. 82; 115], што сведчыць на карысць статуса горада як рэлігійнага цэнтра.

Асаблівае значэнне меў гэтаксама Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага – вышэйшы ўсесаслоўны выбарны суд, вядомы з 1582 г. Правядзенне яго пасяджэнняў у Наваградку падкрэслівае, што горад нават у XVI ст. захоўваў уплывовы статус, з'яўляўся адным з цэнтраў судовай улады. Гэта сведчыць аб яго важнай ролі ў палітычнай і прававой сістэме ВКЛ, што яшчэ больш узмацняе яго гістарычнае значэнне.

Такім чынам, Наваградак быў не толькі важным палітычным і культурным цэнтрам, але і стратэгічна значнай крэпасцю, якая мела ўсе прыкметы сталіцы. Паводле А. Краўцэвіча, Наваградак быў ключавой сілай у стварэнні ВКЛ. Яго роля як цэнтра балта–славянскага сімбіёзу, адміністрацыйнай і культурнай асновы дазваляе сцвярджаць, што ён выконваў функцыі сталіцы de facto на раннім этапе, нават пры адсутнасці фармальнага статусу [6, с. 31; 34].

Літоўскія даследчыкі часта лічаць першай сталіцай ВКЛ Кернаў (Кернаве). Вандруючы па Літве і наведаўшы Кернаў, літоўскія гіды гатовыя паказаць нават гэтак званы «Трон Міндоўга», размешчаны на адным з пагоркаў Кернаўскага гарадзішча. Аднак, калі для Наваградка існуюць канкрэтныя звесткі пра валоданне ім Міндоўгам, то ў выпадку Кернава няма дакладных дакументальных сведчанняў, якія б пацвярджалі яе сталічны статус. Кернаў У.Ц. Пашута называе «сталіцай Трайдэна» у 70–я гг. XIII ст. [3, с. 232], тады як А. Краўцэвіч называе гэты горад родавымі ўладаннямі Трайдэна, каторыя ўвайшлі ў склад Літвы пад час яго княжання (1269/70–1282) [6, с. 55].

Каронацыя Міндоўга ў Вільні – гэтая тэма, якая з'явілася ў літоўскіх навуковых колах, але яна не знайшла падтрымкі ў большасці даследчыкаў. Ідэя каранацыі Міндоўга ў Вільні звязана з даследаваннем Віленскага сабора Св. Станіслава, галоўнага храма сучаснай Літвы. У савецкія гады архітэктар Напалеон Кітаўскас прапанаваў версію, што сабор быў пабудаваны значна раней, чым лічаць сёння, і спрабаваў датаваць яго XIII ст. Гэтыя версіі знайшлі падтрымку ў некаторых літоўскіх гісторыкаў, якія звязвалі сабор з хрышчэннем Міндоўга і нават з яго каранацыяй. Аднак, у 1980–я гг. Аксана Валіоніене (Oksana Valioniene) апублікавала сваю працу «Pirmosios Vilniaus sventyklos tyrimu problema» [9], у якой абвергла гэту версію, паказаўшы, што «квадратны будынак» пад сучасным саборам быў збудаваны не раней за першую чвэрць XIV ст., у часы Вялікага князя Гедзіміна (1316–1341). Такім чынам, версія пра каронацыю Міндоўга ў Вільні з'ўляецца міфам.

Існуе цікавая праца гісторыка В.А. Вароніна: «Навагрудак – першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Генезіс легенды» [10], у каторай аўтар спрабуе аспрэчыць ідэю пра сталічны статус Наваградка.

Таму зноў варта падкрэсліць: у гістарыяграфіі адсутнічаюць першасныя інстытуцыйныя крыніцы, якія б афіцыйна замацоўвалі за якім–

небудзь горадам статус сталіцы ў перыяд да 1323 г. Гіпатэтычнае сцвярджэнне пра «сталічнасць» Наваградка або іншых гарадоў у XIII–пачатку XIV ст. абапіраецца выключна на наратыўныя крыніцы Позняга Сярэднявечча (XV–XVI стст.), што ставіць пад сумнеў іх адміністратыўнае, а не сімвалічнае значэнне.

Калі казаць пра Наваградак як «першую сталіцу», варта адзначыць, што асноўныя апаненты такой пазіцыі – літоўскія даследчыкі – актыўна адстойваюць свае версіі. Яны заяўляюць, што менавіта такія гарады, як Варута, Кернаў (Кернаве) і Трокі (Тракай), павінны лічыцца сталіцамі ВКЛ. Аднак гістарычныя звесткі пра гэтыя гарады таксама маюць паўлегендарны характар.

Пры больш уважлівым аналізе аргументы літоўскага боку выглядаюць не так адназначна. Напрыклад, Варута згадваецца толькі адзін раз у Іпацьеўскім летапісе і яе дакладнае месцазнаходжанне дагэтуль невядомае. Варута, якая належала Міндоўгу, – яе сталічнасць, ці то як горада, ці то як невялікай крэпасці, абгрунтоўваецца бяздоказна прыкладна так жа, як і сталічнасць Кернавы пры Трайдзене: калі населены пункт згадваецца ў сувязі з імем манарха, значыць, ён і ёсць ягоная сталіца.

На гэтым фоне асабліва вылучаюцца два гарады, чый сталічны статус можна лічыць бясспрэчным. Па–першае, гэта Вільня – адзіная афіцыйна прызнаная сталіца ВКЛ з часу яе ўзвышэння пры вялікім князі Гедзіміне. Па–другое, гэта Горадня – фактычная сталіца. Магчыма, ён упершыню выцесніў Вільню з пазіцыі галоўнага горада Вялікага княства яшчэ пры Стэфане Баторыі. Таму на антрапаморфнай карце «Europa regina», выдадзенай у 1587 г., Горадня пазначана як сталіца ВКЛ. Стаўшы соймавым горадам Рэчы Паспалітай, Горадня ператварылася ў неафіцыйную, але рэальную сталіцу. Пра гэта пісаў у сваіх мемуарах англійскі падарожнік XVIII ст. Уільям Кокс. Таксама пра сталічнасць Горадні згадваў Станіслаў Аўгуст, кароль і вялікі князь, а гродзенскія езуіты ў сваёй хроніцы называлі яго Metropolis Grodnensis.

Падсумоўваючы ўсё вышэйказанае адзначым, што Наваградак, безумоўна, адыгрываў значную палітычную і культурную ролю на раннім этапе гісторыі ВКЛ. Хоць фармальны статус сталіцы быў прысвоены Вільні толькі ў 1323 г., Наваградак, пачынаючы з часу кіравання Міндоўга (1238–1263), фактычна выконваў функцыі галоўнага палітычнага і адміністрацыйнага цэнтра. У гэтым горадзе канцэнтраваўся ўрад Міндоўга, прымаюцца важныя дзяржаўныя рашэнні, вяліся перамовы з суседзямі, у тым ліку з Галіцка–Валынскім княствам. Гэта падкрэслівае значэнне Наваградка ў дзяржаўным жыцці таго часу.

Археалагічныя знаходкі, у тым ліку пячаткі князёў, рэшткі храмаў, раскошныя артэфакты, сведчаць пра развітую гарадскую інфраструктуру, развітыя рамёствы і гандлёвыя сувязі, што яшчэ раз пацвярджае высокі культурны і эканамічны статус горада. Размяшчэнне горада на важным гандлёвым шляху між балцкімі і славянскімі землямі таксама садзейнічала

яго культурнай і эканамічнай ролі. Наваградак не толькі выконваў ваенна–стратэгічныя функцыі, але і быў месцам сінтэзу балцкай і славянскай культур, што адлюстроўвалася ў праваслаўных і каталіцкіх храмах горада.

Наваградак выконваў функцыі сталіцы, але без афіцыйнага замацавання гэтага статусу. Горад быў галоўным палітычным цэнтрам, важным ваенным і культурным хабам, дзе складаліся асновы будучай дзяржаўнасці. З пераносам цэнтра ўлады ў Вільню ў пачатку XIV ст. статус Наваградака як сталіцы быў заменены, але яго гістарычная роля як калыскі ВКЛ не знікла. Наваградак застаўся сімвалам пачатку фарміравання ВКЛ і яго значным гістарычным цэнтрам.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Каргер, М.К. Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке / М.К. Каргер // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. – 1977. – Вып. 150. – С. 79–85.

2. Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок (посад – окольный город) / Ф.Д. Гуревич. – Ленинград : Наука, 1991. – 159 с.

3. Пашуто, В.Т. Образование литовского государства / В.Т. Пашуто. – М. : АН СССР, 1959. – 531 с.

4. Міцкевіч, А. Свіцязь [Электронны рэсурс] / А. Міцкевіч. – Рэжым доступу : https://karotkizmest.by/беларуская–літаратура/адам–міцкевіч/адам–міцкевіч–свіцязь.html. – Дата доступу: 16.03.2025.

5. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь : Полацкі і новагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 366 с.

6. Краўцэвіч, А. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, 1248–1377 гг. / А. Краўцэвіч. – Гародня [Гродна] Уроцлаў [Вроцлаў] : Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka–Jeziorańskiego we Wrocławiu, 2015. – 302 с.

7. Пічэта У.І. Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2005. – 179 с.

8. Кроніка Быхаўца [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/none/Kronika_Bychauca.html. – Дата доступу: 16.03.2025.

9. Valionienė, A. Pirmosios Vilniaus šventyklos tyrimų problema / A. Valionienė // Lietuvos istorijos metraštis. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutas, 2017. – Т. 1. – С. 5–21.

10. Варонін, В.А. Навагрудак – першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Генезіс легенды / В.А. Варонін // Счастье не в награде за доблесть, а в самой доблести : Материалы междунар. науч. круглого стола, посвящ. 70–летнему юбилею проф. В. А. Федосика, Минск, 9 февр. 2021 г. / Белорус. гос. ун–т. – Мінск : БГУ, 2021. – С. 190–196.

*УДК 34.096*